УДК 947.2:323.311

Дамарад А.А., ст. выкл., канд. гіст. навук (БДТУ, г.Мінск)

# ДЗЕЙНАСЦЬ ДВАРАНСКІХ ДЭПУТАЦКІХ КАМІСІЙ У БЕЛАРУСІ І ЎКРАІНЕ Ў 20–40 ГГ. XIX СТ.

Дваранскае самакіраванне ў Расійскай імперыі было замацавана толькі ў час кіравання імператрыцы Кацярыны ІІ. Між тым, на тэрыторыі беларускіх і ўкраінскіх губерняў з XVI ст. існавала грамадская і прававая традыцыя шляхецкіх павятовых соймікаў. Таму дваранскія павятовыя сходы не сталі новым для мясцовага шляхецтва. Важным бачыцца праблема выкарыстання магчымасцяў новых саслоўных органаў прадстаўнікамі мясцовай шляхецкай грамады.

Не адмовіліся ад такой практыцы і пры выбарах у дваранскія дэпутацкія сходы. У прыватнасці, пад час выбараў у дваранскі сход Падольскай губерні ў 1808 г. паліцыя арыштавала значную частку дэпутатаў, звольніла губернскага маршалка і віцэ-губернатара. У 1809 г. выбары ў Віленскай губерні ўвогуле не адбыліся па прычыне знішчэння спісаў выбаршчыкаў і скрыні з бюлетэнямі.Рэвізіі паказвалі, у прыватнасці, што ў беларускіх і ўкраінскіх губернях дваранскія сходы ўносілі ў дваранскія спісы асоб без права на такі статус. Падобныя праявы беззаконня і гвалту мелі месца і ў іншых рэгіёнах. Напрыклад, арышты дэпутатаў, унясенне ў дваранскія спісы пабочных асоб мела месца ў Арлоўскай, Тульскай і Курскай губернях[1, с. 335].

Важным у дзейнасці дваранскіх дэпутацкіх сходаў стала імкненне дзяржаўнай адміністрацыі абмежаваць іх кампетэнцыю і аказваць уплыў на працу.

Такім чынам, дзейнасць дваранскіх дэпутацкіх сходаў у першай палове XIX ст. была засяроджана вакол вырашэння «шляхецкага пытання». Ва ўкраінскіх губернях ініцыятарам стварэння інвентарных камісій, якія ў тым ліку правяралі адпаведнасць дакументаў рашэнням дваранскіх дэпутацкіх сходаў, стаў прызначаны генерал-губернатарам Кіеўскай губерні Д. Г. Бібікаў. Убачыўшы ягоную руплівасць у процідзеянні карпаратыўным інтарэсам шляхты заходніх губерняў, Мікалай І зрабіў яго таксама генерал-губернатарам Падолля і Валыні. Вынікам такіх мерапрыемстваў стала больш значная у параўнанні з Беларуссю колькасць асоб, якія так і не зацвердзілі свій дваранскі статус.

## ЛІТАРАТУРА

1 Корф, С.А. Дворянство и его сословное управление за столетие 1762 – 1855 гг. / С. А. Корф. – СПб.: тип. Тренке и Фресно, 1906. – 722 с.